# Прыкладнае каляндарна-тэматычнае планаванне
# *«Чалавек і свет»* для 1 класа
# ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання
# (2017/2018 вучебны год)

1. Трафімава, Г.У. Чалавек і свет: вуч. дапаможнік для 1-га кл. устаноў агульнай. сяр. адукацыі з бел. мовай навучання: для работы ў класе / Г.У. Трафімава, С.А. Трафімоў. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2017.
2. Трафимова, Г.В. Человек и мир. 1 класс. Книга для чтения: пособие для учителей учреждений общ. сред. образования с бел. и рус. яз. обучения / Г.В. Трафимова, С.А. Трафимов. – Минск : Нац. ин-т образования, 2017.
3. Трафимова, Г.В. Человек и мир. 1 класс: рабочая тетрадь / Г.В. Трафимова, С.А. Трафимов. – Минск : Аверсэв, 2017.
4. Трафимова, Г. В. Учебный предмет "Человек и мир" в 1 классе : учебно-методическое пособие для учителей учреждений общ. сред. образования с рус. и белорус. яз. обучения / Г.В. Трафимова, С.А. Трафимов. – Минск : Нац. ин-т образования, 2017.

## I чвэрць (1 г у тыдзень)

| № урока, дата | Тэма ўрока | Мэты ўрока | Асноўныя віды дзейнасці |
|---|---|---|---|
| 1 | Наша Радзіма — Беларусь | Фарміраваць уяўленні пра нашу Радзіму – Беларусь, яе сталіцу, Дзяржаўны герб і Дзяржаўны сцяг Рэспублікі Беларусь.<br>Садзейнічаць выхаванню любові да сваёй Радзімы, пачуцця гонару і захаплення сваёй Радзімай, яе прыродай.<br>Садзейнічаць развіццю пазнавальнага інтарэсу да вывучэння навакольнага свету | Азнаямленне з вучэбным дапаможнікам "Чалавек і свет" (ВД) і правіламі работы з ім.<br>Выказванні, пра што хацелася б даведацца на ўроках "Чалавек і свет". Вызначэнне тэмы ўрока.<br>Актуалізацыя ведаў пра сваю краіну: разглядванне фатаграфій і падрыхтоўка адказаў на пытанні (ВД, с. 4); засваенне ў ходзе гутаркі паняццяў "Радзіма", "сталіца".<br>Удзел у гутарцы па пытаннях: "Чаму Беларусь называюць краем блакітных рэк і азёр, зялёных лясоў? Чаму нашу Радзіму называюць Беларусь?" Слуханне апавядання з кнігі для чытання "Ключы з мінулага" (с. 8-9), абмеркаванне прачытанага. Разглядванне Дзяржаўнага герба Рэспублікі Беларусь (ВД, с. 4), падрыхтоўка адказаў на пытанні. Праслухоўванне апавядання "Наш герб" (кніга для чытання, С. 9-10). |

| | | | |
|---|---|---|---|
| | | | Удзел у гульні "Так - воплеск, не - маўчок" па пытаннях пра Дзяржаўны герб Рэспублікі Беларусь.<br>Разглядванне выявы Дзяржаўнага сцяга Рэспублікі Беларусь (ВД, с. 4). Праслухоўванне апавядання "Наш сцяг", падрыхтоўка адказаў на пытанні пасля праслухоўвання.<br>Выказванні пра тое, дзе можна бачыць Дзяржаўны герб і Дзяржаўны сцяг Рэспублікі Беларусь. Разглядванне дакументаў з выявай Дзяржаўнага герба Рэспублікі Беларусь (дакументы дэманструе настаўнік).<br>Разглядванне дзяржаўных сімвалаў некалькіх дзяржаў, знаходжанне дзяржаўнай сімволікі Рэспублікі Беларусь.<br>Работа ў групах: разглядванне фатаграфій (ВД, с. 5), складанне апавядання пра сталіцу нашай Радзімы.<br>Удзел у гутарцы пра свой населены пункт, адрас сваёй школы |
| 2 | Што такое прырода. Жывая і нежывая прырода | Фарміраваць уяўленні пра аб’екты прыроды і аб’екты працы чалавека, пра адрозненні аб’ектаў жывой і нежывой прыроды, вучыць іх адрозніваць.<br>Садзейнічаць развіццю ўвагі, мыслення і машчлення | Удзел у дыдактычнай гульні на канцэнтрацыю ўвагі.<br>Знаёмства з тэмай урока.<br>Работа ў парах: разглядванне малюнкаў (ВД, с. 6), падрыхтоўка адказаў на пытанні. Азнаямленне з паняццямі "аб'екты прыроды", "аб'екты працы чалавека - вырабы".<br>Удзел у гутарцы: называнне аб'ектаў прыроды і вырабаў. Выказванні пра тое, што можна зрабіць самім з аркуша паперы або кавалка пластыліну.<br>Выкананне заданняў на замацаванне ўменняў класіфікаваць аб'екты навакольнага свету на аб'екты прыроды і аб'екты працы чалавека (ВД, с. 7).<br>Работа ў парах. Разглядванне малюнкаў (ВД, с. 8), падрыхтоўка адказаў на пытанні.<br>Удзел у гутарцы пра агульныя прыметы раслін і жывёл, слуханне апавядання настаўніка пра адметныя прыметы жывых арганізмаў.<br>Выкананне задання (ВД, с. 9): вызначэнне аб'ектаў прыроды па сілуэтах. Праца ў групах. Абмеркаванне прыкладаў аб'ектаў жывой прыроды. Азнаямленне з паняццем "нежывая прырода": разглядванне малюнкаў (ВД, с. 9) і адказы на пытанні да іх.<br>Слуханне тэксту пра адметныя прыметы аб'ектаў нежывой прыроды, |

| | | | |
|---|---|---|---|
| | | | падрыхтоўка адказаў на пытанні пасля праслухоўвання. Выкананне заданняў на замацаванне ўменняў групаваць аб'екты навакольнага свету па ўказаных прыметах: гульнявыя заданні "Парныя карцінкі" (аб'екты прыроды і аб'екты працы чалавека), "Так - воплеск, не - маўчок" (аб'екты жывой і нежывой прыроды).<br>Удзел у выніковай гутарцы па вывучанай тэме |
| 3 | Змены ў нежывой прыродзе восенню. Мэтавая прагулка “Залатая восень у прыродзе” | Фарміраваць уяўленні пра змены ў нежывой прыродзе восенню і іх прычыны. Ствараць умовы для замацавання паняццяў “жывая прырода”, “нежывая прырода”.<br>Садзейнічаць развіццю інтарэсу да пазнання навакольнага свету.<br>Садзейнічаць развіццю ўменняў параўноўваць аб’екты, устанаўліваць прычынна-выніковыя сувязі ў прыродзе | Удзел у мэтавай прагулцы “Залатая восень у прыродзе”: назіранне за аб’ектамі прыроды на школьным двары, паўтор прымет жывой і нежывой прыроды, высвятленне восеньскіх змяненняў у нежывой прыродзе (назіранні за вышынёй Сонца над зямлёй, пахаладаннем паветра ў параўнанні з летам), назіранні за зменамі ў жыцці раслін восенню.<br>Разважанні на тэму "Які перыяд восені называюць залатым і чаму?" Падрыхтоўка адказаў на пытанне: «Якія пачуцці выклікае восеньская прырода?»<br>Удзел у гутарцы пра восеньскія месяцы года (ВД, пытанні, с. 10). Разглядванне сюжэтных малюнкаў (ВД, с. 10), удзел у гутарцы па змесце малюнкаў.<br>Работа ў групах. Складанне апавядання на тэму "Што змяняецца ў нежывой прыродзе з прыходам восені?". Заслухоўванне адказаў груп. Праслухоўванне тэксту пра змены ў нежывой прыродзе (ВД, с. 10). Удзел у гульні-пантаміме пра восеньскія прыметы ў нежывой прыродзе. Выкананне заданняў на замацаванне ведаў: разглядванне малюнкаў, вызначэнне тых, на якіх намалявана восеньскае надвор'е; разглядванне схематычнай выявы Сонца на небе, працягласці дня і ночы, выбар малюнкаў з прыметамі восені.<br>Работа ў парах. Разглядванне малюнкаў і выкананне задання (ВД, с. 11). Слуханне апавядання настаўніка "Чаму ідзе дождж?" (тэкст у кнізе для чытання на с. 22).<br>Гутарка пра туманы з апорай на жыццёвы вопыт вучняў, малюнак (ВД, с. 11), апавяданне ў кнізе для чытання (с. 23-24).<br>Удзел у гутарцы пра замаразкі восенню і іх прыметы: з'яўленне лёду на лужынах, інею на траве і глебе (ВД, пытанні, с. 11). |

| | | | |
|---|---|---|---|
| | | | Разглядванне малюнкаў. Выбар малюнкаў з выявай ападкаў, якія бываюць восенню.<br>Выкананне пісьмовага задання "Так - Не" (адказы з дапамогай кругоў чырвонага і зялёнага колеру на пытанні па вывучанай тэме). Праверка самастойнай працы – зверка з узорам.<br>Інфармацыя настаўніка пра падрыхтоўку да наступнага ўрока-экскурсіі |
| 4 | Экскурсія "Змены ў нежывой прыродзе і жыцці раслін восенню" | Пазнаёміць з правіламі паводзін на экскурсіі.<br>Працягваць фарміраванне ўяўленняў пра змены ў прыродзе восенню, пра ўзаемасувязь змяненняў у жывой і нежывой прыродзе.<br>Стварыць умовы для засваення вопыту назірання, вучыць пазнаваць расліны па лісці і пладах, устанаўліваць прычынна-выніковыя сувязі ў прыродзе.<br>Працягваць развіваць назіральнасць, уменні аналізаваць, абагульняць назіранні ў прыродзе.<br>Садзейнічаць выхаванню экалагічна правільных паводзін у прыродзе | Азнаямленне з правіламі паводзін на экскурсіі з апорай на малюнкі першага форзаца ВД.<br>Знаёмства з тэмай і задачамі экскурсіі, з маршрутам экскурсіі.<br>Удзел у экскурсіі.<br>Прыпынак 1: назіранні і ўдзел у гутарцы пра змены ў нежывой прыродзе восенню.<br>Прыпынак 2: выяўленне восеньскіх змен у жыцці раслін (назіранні за завяданнем травяністых раслін, за зменай афарбоўкі лісця дрэў і кустоў, збор пладоў дрэў і кустоў, аналіз вынікаў назіранняў).<br>Удзел у гутарцы пра змены ў жыцці раслін восенню, праслухоўванне тлумачэнняў на пытанні: "З-за чаго восенню лісце жоўкне?", "Чаму восенню з'яўляюцца чырвонае і фіялетавае лісце?", "Чаму восенню лісце бэзу, алешыны, некаторых яблынь не змяняюць зялёную афарбоўку?"<br>Прыпынак 3: назіранне за лістападам і высвятленне яго прычын. Удзел у гутарцы па пытаннях: "Чаму восенню ападае лісце з галінак?", "Ці ёсць на галінках ранкі ад апалага лісця?", "Навошта дрэвы скідаюць лісце ўвосень?"<br>Падвядзенне вынікаў экускурсіі: пра што новае даведаліся, чаму навучыліся |